Аналіз атрыманых вынікаў паказаў, што такія каштоўнасныя арыентацыі студэнцкай моладзі і выпускнікоў школ займаюць аднолькавае рангавае месца ("адукацыя" – 3; "цікавая праца" – 6). На якіх рангавых месцах знаходзяцца такія прафесійныя каштоўнасці як "прафесія, якая адказвае здольнасцям" у студэнтаў – 12, выпускнікоў школ – 11. Гэта ўказвае на невысокі ўзровень прафесійнай накіраванасці моладзі як у працэсе прафесійнага самавызначэння (старшакласнікі), так і ў працэсе прафесіяналізацыі (студэнты).

Вынікі анкетавання паказалі, што выбар прафесіі пераважная большасць моладзі робіць на заключным этапе навучання ў школе. У сувязі з гэтым трэба вызначыць, што правільны адбор і давузаўская падрыхтоўка з'яўляюцца неабходнай умовай у справе выхавання і прафесійнага станаўлення будучых біялагічных спецыялістаў.

## АНАЛІЗ ДАСЛЕДАВАННЯЎ РАЗВІЦЦЯ КРЭАТЫЎНАСЦІ АСОБЫ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ПАДЛЕТКАВАГА ЎЗРОСТУ)

І.А.Малахава (аспірантка)

Актуальнасць даследаванняў развіцця крэатыўнасці абгрунтоўваецца перш за ўсе глыбокімі сацыяльнымі з'явамі. Так, амерыканскія вучоныя сцвярджаюць, што для ЗША выяўленне і вырошчванне творчых асоб з'яўляецца праблемай агульнасацыяльнай значнасці, паколькі творчая дзейнасць мае вялікае ўздзеянне не толькі на навуковы прагрэс, але і на ўсе грамадства ўвогуле, а тыя з краін, якія змогуць лепш за другія распазнаваць творчыя асобы, развіваць іх і ствараць для іх самыя спрыяльныя ўмовы, будуць мець вялікую перавагу.

Асабліва важным творчы падыход аб'яўляецца ва ўмовах рэзкіх перамен у грамадскім жыцці, таму што дазваляе пераадолець узнікаючыя цяжкасці, намеціць новыя нечаканыя мэлі, забяспечыць большую свабоду выбара, і, такім чынам, большую свабоду ў дзеяннях. Творчы падыход робіць больш лёгкім, эканамічным і эфектыўным навучанне. У апошніх даследаваннях замежных псіхолагаў творчая дзейнасць называецца ў якасці прадпасылкі разумовага здароўя і ўнутранай задаволенасці. Звяртаецца ўвага на тое, што яна з'яўляецца дзейсным інструментам кіравання як дзіцячымі ім-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пульсамі, так і асобай дарослага чалавека.

Такім чынам, зварот увагі да праблем творчасці ў сучасны момант выкліканы перш за ўсе ўсведамленнем грамадскай значнасці гэтых пытанняў, а таксама ўнутранай логікай развіцця псіхалогіі як навукі. Таму пытанні творчай дзейнасці, выхавання крэатыўнасці паўстаюць як першачарговыя ў сучаснай сістэме адукацыі ў ЗША і другіх краін Заходняй Еўропы. Ва ўмовах, калі сярод даследчыкаў няма дамоўленасці аб сутнасці большасці паняццяў (так Е.Торрэнс, напрыклад, налічыў 84 дзеючых азначэння паняцця "творчаскасць") патрэбна агаворваць, які змест мае той ці іншы тэрмін.

Што датычыцца вызначэння сэнсу самога тэрміна "творчаскасць", то, на наш погляд" цікавымі з'яўляюцца думкі амерыканскага псіхолага Э.Фрома, які прапанаваў крытэрыем творчасці лічыць не якасць выніку, а характарыстыкі і працэсы, што актывізуюць творчую прадуктыўнасць. Калі гаворка заходзіць аб выхаванні крэатыўнасці, то маецца на ўвазе развіццё здольнасцей і схільнасць да такіх заняткаў, у выніку якіх будзе атрыманы творчы прадукт.

Вядома, што замежныя даследчыкі ўжываюць спецыяльны тэрмін для вызначэння творчых здольнасцей - "крэатыўнасць", паяўленне якога сімвалізуе пачатак шырокага фронту даследаванняў творчых магчымасцей чалавека, які разгарнуўся ў сярэдзіне нашага стагоддзя. Крэатыўнасць трактуецца як здольнасць да творчага стылю дзейнасці. Сутнасць яе складаецца не з простага пераліку назапашаных ведаў, а ў здольнасці якасна, па-новаму, іх выкарыстаць, накіраваць на атрыманне арыгінальных ідэй, вынікаў.

Вывучаючы ступень распрацаванасці праблемы творчасці, існуючы тэрміналагічны апарат, і улічваючы становішча гэтай праблемы на сучасным этапе развіцця навукі, мы згодны лічыць, што паняцце крэатыўнасць (ад лат.          - ствараць) ахоплівае сукупнасць мысліцельных і асобовых якасцей (здольнасцей), садзейнічаючых выяўленню і станаўленню творчасці. Такое разуменне крэатыўнасці як нейкай сутнасці, якая не вычэрпваецца сумай прымет, а абумоўлівае змену адносін да самых гэтых прымет, дзе яны пераўтвараюцца з сутнасных характарыстык у паказальнікі нейкай сутнасці, дазваляе вылзяляць тры падыходы да вывучэння ўзроставых заканамернасцей крэатыўнасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ КИ

Першы падыход прадугледжвае сувязь максімальнай прадуктыўнасці з узростам на падставе аналіза адпаведных вынікаў дзейнасці. Так, амерыканскія даследчыкі Г.Леман і У.Дэніс, вывучаючы жыццёвы шлях многіх славутых вучоных, мысліцелей і мастакоў за некалькі стагоддзяў прыйшлі да выніку, што ў матэматыкаў пік творчай актыўнасці прыходзіцца на 23 гады, у хімікаў – на 29–30 лет, у фізікаў – на 32–33 гады і г.д.

Другі падыход можна назваць асабовым: параўноўваючы якасці людзей, славутых творчымі дасягненнямі, з якасцямі людзей меньш прадуктыўных, даследчыкі прадпрымаюць папытку вылучыць важнейшыя рысы творчай асобы. Такія работы П.Энгельмейера, Э. Фрома і др.

Трэці падыход прапануе вывучэнне самых мысліцельных працэсаў, якія дапушчальна адрозніваюць творчую думку ад нетворчай. Такі, у прыватнасці, падыход Я.Панамарова, які разглядае творчы працэс як вынік узаемадзеяння розных узроўняў інтэлектуальнай актыўнасці.

Калі падлеткавы ўзрост характарызуецца рэзкім узрастаннем індывідуальных адрозненняў, якія праяўляюцца ў развіцце самастойнасці мышлення, актыўнасці ў пастаноўцы даследчыцкіх пытанняў і пошуку іх вырашэння, то гэта дазваляе разглядаць перыяд ад 10 да 15 год як сензітыўны для фармавання самастойнага, творчых занятках вытлумачваецца яшчэ і тым, што непасрэдна пры пераходзе з дзяцінства ў малалецтва рэзка павялічваецца аб'ект ведаў, колькасць і якасць лагічных мысліцельных аперацый, выкананых на падставе гэтых ведаў; знікае неабходнасць з дапамогай фантазіі дабудоўваць недастаючыя паверхі ў.логіцы думкі. Акрамя таго, і у навучальным працэсе ўсе меньш часу адводзіцца творчым заняткам. Пагэтаму падае прэстыж уяўлення як каштоўнай якасці асобы. А як вядома, уяўленне і фантазія з'яўляюцца асноўнымі паказальнікамі дзіцячай крэатыўнасці.

Такім чынам, непасрэдна ў падлеткавым узросце неабходна ствараць спецыяльныя ўмовы для пастаяннай падпіткі гэтай жывіцельнай крыніцы – творчага уяўлення. Больш таго, па оправядлівому меркаванню Л.Выготскага, творчасць – норма дзіцячага развіцця, якая асабліва характэрна для падлеткаў. Таму вельмі важна, каб асновай выхавання і навучання дзяцей на ўсіх этапах стаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

галоўны прынцып, які вызначыў развіццё чалавецтва – творчасць, што пацвярджае аналіз даследаванняў развіцця крэатыўнасці асобы.

## МАГЧЫМАСЦІ БІБЛЕЙСКАЙ, АНТЫЧНАЙ І НАЦЫЯНАЛЬНАЙ МІФАЛОГІІ Ў ФАРМІРАВАННІ У СТУДЭНТАЎ УЯЎЛЕННЯЎ АБ ФЕНОМЕНЕ ДЗЯЦІНСТВА

В.А.Грачова

Асаблівая роля дзяцінства у жыцці чалавека, яго працягласць, перыядызацыя і іншыя канстанты толькі параўнальна нядаўна (у гістарычных маштабах) сталі прадметам увагі вучоных, практыкаў, урэшце усяго грамадства. У станаўленні уяўленняў аб феномене дзяцінства у студэнтаў-культуролагаў важную ролю адыгрывае выкладанне гісторыі педагогікі, а у ім – у сваю чаргу – знаёмства са старажытнымі, міфалагічнымі вытокамі таго, што сёлета прынята называць агульначалавечымі каштоўнасцямі.

Спрадвечную мудрасць народаў міра, іх гістарычны вопыт (у тым ліку вопыт этычны і эстэтычны) змяшчаюць міфы. Сення гэта ісціна нарэшце не мае патрэбы у доказах. Да апублікавання дапушчаных разам з антычнай біблейская міфалогія, а таксама паганскія міфы розных народаў, у тым ліку славян. Міфы даюць нам уяўленне аб адыходзячых у таўшчыню стагоддзяў каранях менталітэту і нацыянальнага характару. Сюжэты і вобразы міфаў увайшлі у творы розных відаў і жанраў мастацтва, сталі свайго рода мастацкім "эсперанта". Аднак публікацыя яшчэ не азначае глыбокага асваення матэрыяла усімі тымі, каму ён накіраваны, асобна будучымі культуролагамі. Нашы апытанні паказалі, што веданне міфалагічных сюжэтаў і вобразаў яшчэ не стала часткай уяўленняў аб элементарнай гуманітарнай адукаванасці. Няясна пакуль, у якім узросце мэтазгодна знаёміць вучняў з міфалогіяй.

Трохгадовы вопыт выкладання у ВНУ гісторыі педагогікі у кантэксце гісторыі мастацтва, а таксама выкладання сусветнай мастацкай культуры у школе з тэатральным ухілам дае падставу зрабіць першапачатковыя вывады аб месцы міфалогіі у вучэбным працэсе, аб уплыве вывучэння гэтага курса на фарміраванне шэрагу ведаў і уяўленняў. Нашы вывады датычацца зместа заняткаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ